

**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**



**Колькасць ахвотных пабываць у Нясвіжскім палацы няўхільна расце, а калі так здарыцца, што лік турыстаў перавысіць паўмільёна чалавек за год, можа ўзнікнуць пагроза для экспанатаў.** СТАР. 6



**Дзень 17 верасня ў Ляцягах традыцыйна пачынаецца ў маленькай вясковай царкве. Яна знаходзіцца ў звычайным доме, але ад гэтага, здаецца, набывае яшчэ больш чароўнасці, хатняй і цёплай.** СТАР. 6


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 верасня 2012 г. ПЯТНІЦА № 183 (27298) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# СЛАВІМ ХЛЕБ І РУКІ ЗАЛАТЫЯ







Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА і БЕЛТА.











Каб расказаць пра ўсіх працаўнікоў сяла, дзякуючы якім хлеб застанецца галавой на стале кожнага беларуса, на жаль, не хопіць ніякіх газетных палос. Таму ў сённяшнім нумары — толькі пра асобных: камбайнера агракамбіната «Ждановічы» Міхаіла САЛАДУХУ, аператара збожжасушыльнага комплексу СВК «Астрамечава» Леаніда МАРЦІШКУ, камбайнераў агракамбіната «Холмеч» Валянціна САЛАМАХУ і Аляксандра ГРАНЯ, кіроўцу СВК «50 гадоў Кастрычніка» Мікалая ТАЛКАЧОВА. Яны разам са сваімі калегамі — механізатарамі, кіроўцамі, аграномамі, інжынерамі, камбайнерамі з усіх абласцей краіны — прымуць удзел у цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод і прэмій пераможцам (усяго 247 пераможцаў у 13 намінацыях) рэспубліканскага спаборніцтва па ўборцы збожжавых і зернебабовых культур «Славім хлеб і рукі залатыя».

Гэтая галоўная падзея фестывалю пройдзе на сцэне амфітэатра моладзевага культурна-забаўляльнага цэнтра, які пабудаваны спецыяльна да «Дажынак-2012» на тэрыторыі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. Лепшыя з лепшых за высокія дасягненні ў вытворчасці збожжа атрымаюць ганаровыя дыпломы, грашовыя прэміі, кветкі і каштоўныя падарункі, у тым ліку і з рук Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сярод падарункаў — скутары і матацыклы, мотаблокі і халадзільнікі, дамашнія кінатэатры і тэлевізары, а таксама суперпрызы — легкавыя аўтамабілі.

Акрамя таго, на «Дажынках» будуць адзначаны ганаровымі дыпломамі, кветкамі, тэлевізарамі, халадзільнікам, маразільнікамі і веласіпедамі пераможцы рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла». А таксама пераможцы рэспубліканскага агляду-конкурсу «Землекарыстанне высокай культуры земляробства, добраўпарадкавання машынных двароў, жывёлагадоўчых фермаў і комплексаў». Апошнія атрымаюць дыпломы і грашовыя прэміі, у тым ліку і для набыцця трактара «Беларус-82.1».

Што тычыцца вынікаў, то сёлетняя ўборачная прайшла зладжана і арганізавана. Прынамсі, пра гэта сведчаць лічбы, якія агучыла «Звяздзе» прэс-сакратар Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Вольга СРЭДНЕВА. Так, сёлета ва ўсіх катэгорыях гаспадарак намалочана 9 млн 166 тысяч тон збожжа. Гэта больш, чым летась, на 1 млн тон. Сярэдняя ўраджайнасць па рэспубліцы — 37,3 ц/га. Аб'ёмы харчовай пшаніцы, жыта, аўса і ячменю, якія пастаўлены на прадпрыемствы хлебапрадуктаў, дазволяць цалкам забяспечыць патрэбнасць млыноў і заводаў рэспублікі ў сыравіне да новага ўраджаю.

Хоць свята і ў разгары, але аграрыі не спяць у шапку. Бо да канца года трэба выканаць яшчэ шмат работ. Цяпер ідзе ўборка кукурузы на зерне. Па папярэдніх ацэнках, агульны валавы збор зерня за кошт зерня кукурузы папоўніцца больш як на 1 млн тон. У разгары ўборка кукурузы на зялёны корм і сілас для патрэб жывёлагадоўлі, а таксама — цукровых буракоў, бульбы і гародніны. Практычна завершана сяўба азімых збожжавых культур.

Свята скончыцца, і героі сёлетніх «Дажынак» са станоўчымі эмоцыямі, падарункамі і новымі сіламі вернуцца ў свае гаспадаркі, каб дапамагчы калегам, якія не паехалі ў Горкі і працягваюць працаваць не пакладаючы рук. Ім, магчыма, сёлета пашанцавала менш, яны не занялі прызавыя месцы, але таксама папаўнялі сваімі мазалямі засекі краіны. Таму нізкі паклон усім працаўнікам сяла — і ўзнагароджаным, і тым, узнагароды якіх наперадзе.

**Надзея ДРЫЛА.**

**«Дажынкі» праходзяць у Беларусі штогод з 1996 года па ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Сталіцамі свята хлебароба былі Столін (1996), Масты (1997), Нясвіж (1998), Шклоў (2000), Мазыр (2001), Полацк (2002), Пружаны (2003), Ваўкавыск (2004), Слуцк (2005), Бабруйск (2006), Рэчыца (2007), Орша (2008), Кобрын (2009), Ліда (2010), Маладзечна (2011). Сёлета гасцей з усёй рэспублікі прымаюць Горкі, а ў наступным годзе эстафету свята ў Горак прыме Гомель і Гомельскі раён.**

■ Футбол. Ліга чэмпіёнаў

## БАТЭ АДЫГРАЎСЯ ЗА ЗБОРНУЮ...

**НАДЗВЫЧАЙ удалым для сябе і шакіруючым для саперніка атрымаўся старт беларускага чэмпіёна ў трэцім для яго групавым раўндзе Лігі чэмпіёнаў УЕФА — у гасцях БАТЭ з лікам 3:1 упэўнена перайграў даволі моцны французскі клуб «Ліль», які, дарэчы, з'яўляецца бронзавым прызёрам чэмпіянату Францыі.**

Гэтая перамога БАТЭ стала першай у гісторыі выступленняў клуба ў Лізе чэмпіёнаў, дагэтуль барысаўчане за 12 матчаў 5 разоў згулялі ўнічыю і пацярпелі 7 паражэнняў. Першы гол, як вядро студзёнай вады, французы атрымалі ад Аляксандра Валадзько ўжо на 6-й хвіліне матча, далей вызначаліся на 20-й і 43-й хвілінах Віталь Радзівонаў і Эдгар Аляхновіч. 3:0 пасля першага тайма пры вельмі і вельмі неблагой гульні нашай каманды — такога выніку не чакаў ніхто, асабліва сапернік. У другім тайме гаспадары апамяталіся і прыціснулі барысаўчан да сваіх варот, раз-пораз ствараючы небяспечныя моманты, але, на шчасце, рэалізавалі толькі адзін са шматлікіх. У тым, што беларусы прапусцілі толькі аднойчы, вельмі вялікая заслуга варатара БАТЭ Андрэя Гарбунова. Вынік гэтага матча ўжо вельмі многія СМІ назвалі самай гучнай сенсацыяй першага тура Лігі. У другім матчы нашай групы F мюнхенская «Баварыя» перамагла «Валенсію» — 2:1. Менавіта нямецкая каманда будзе экзаменаваць БАТЭ 2 кастрычніка на мінскім стадыёне «Дынама», і гэта будзе сустрэча лідараў групы. Гучыць даволі нечакана, але вельмі прыемна.

Вынікі астатніх матчаў. **Група А:** ПСЖ — «Дынама» (Кіеў) — 4:1, «Дынама» (Заграб) — «Порту» — 0:2; **група В:** «Манпелье» — «Арсенал» — 1:2, «Алімпіякас» — «Шальке 04» — 1:2; **група С:** «Малага» — «Зеніт» — 3:0, «Мілан» — «Андэрлехт» — 0:0; **група D:** «Рэал» — «Манчэстэр Сіці» — 3:2, «Барусія» — «Аякс» — 1:0; **група Е:** «Шахцёр» — «Наршаланд» — 2:0, «Чэлсі» — «Ювентус» — 2:2; **група G:** «Барселона» — «Спартак» — 3:2, «Селтык» — «Бенфіка» — 0:0; **група Н:** «Манчэстэр Юнайтэд» — «Галатасарай» — 1:0, «Брага» — ЧФР — 0:2.

**Іван КУПАРВАС.**



Фота БЕЛТА.

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | | |
|---|---|---|
| Брэст | + 15° | |
| Віцебск | + 14° | |
| Гомель | + 16° | |
| Гродна | + 15° | |
| Магілёў | + 9° | |
| Мінск | + 13° | |

### Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.09.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8430,00 | ▲ |
| Еўра | 10940,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 267,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1039,20 | ▲ |

## ЗНОЎ ДАЖДЖЫ

### У суботу на тарфяніках Брэстчыны магчымыя замаразкі

**Надвор'е гэтымі днямі сапсаваў малярухомы атмасферны фронт, што завітаў да нас з боку Заходняй Еўропы. І ў пятніцу гэты франтальны раздзел будзе рухацца далей на ўсход, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму сёння пераважна па паўднёва-ўсходняй палове Беларусі будуць ісці дажджы. Тэмпература паветра 9—16 градусаў. У суботу па ўсходзе краіны, а ўдзень і ў заходніх рэгіёнах чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі туман. Уначы на суботу тэмпература паветра знізіцца да 3—10 цяпла, а на тарфяніках Брэсцкай вобласці магчымыя слабыя замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў. Удзень будзе 12—19 цяпла.

У нядзелю балтыйскі цыклон прынясе да нас чарговую порцыю няўстойлівага надвор'я. Амаль паўсюдна будуць ісці кароткачасовыя дажджы. Тэмпература ўначы 6—12, удзень — ад 9 цяпла па поўначы да плюс 16 градусаў на поўдні краіны.

Месцамі чакаюцца дажджы і ў панядзелак. Уначы будзе 3—10 цяпла, а ўдзень — 10—17, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да плюс 19 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ГАСПАДАРЧЫ СУД КІЕВА АБАВЯЗАЎ УРАД ВЫПЛАЦІЦЬ РАСІІ $390 МЛН

Гаспадарчы суд Кіева часткова задаволіў іск Мінабароны РФ да Кабміна па абавязку карпарацыі «Адзіныя энергетычныя сістэмы Украіны», абавязаўшы ўрад Украіны праз дзяржаўную казначэйскую службу выплаціць расійскаму боку больш за 3 млрд грыўняў, ці каля $390 млн. Рашэнне суда ўступіць у сілу, калі ніводзін з бакоў не абскардзіць яго ў апеляцыйным парадку. Разам з тым, як заявіў напярэдадні першы віцэ-прэм'ер украінскага ўрада Валерый Харашкоўскі, сёння бюджэт ва Украіне з'яўляецца дэфіцытным, і ў ім няма ніводнай лішняй капейкі. Пры гэтым рашэнне суда адносна выплаты Украінай расійскаму боку 3 млрд грыўняў па справе ЕЭСУ — пытанне выключна першай інстанцыі, адзначыў прадстаўнік Кабміна. Доўг перад Міністэрствам абароны Расіі ў памеры $405,5 млн узнік у канцы 1990-х гадоў, калі карпарацыя ЕЭСУ пад кіраўніцтвам Юліі Цімашэнкі не выканала гарантаванае ўрадам Украіны на чале з тагачасным прэм'ер-міністрам Паўлам Лазарэнкам пагадненне аб пастаўках прадукцыі для патрэб расійскага абароннага ведамства.

### БІЛ ГЕЙТС УЗНАЧАЛІЎ ШТОГАДОВЫ СПІС НАЙБАГАЦЕЙШЫХ ЛЮДЗЕЙ ЗША



Аўтарытэтны часопіс «Форбс» апублікаваў свой штогадовы спіс 400 найбагацейшых людзей ЗША. Верхні радок у 19-ы раз запар займае заснавальнік кампаніі «Майкрасофт» Біл Гейтс. Яго багацце ацэньваецца ў $66 млрд, што на $7 млрд больш, чым год таму. На другім месцы — кіраўнік інвестыцыйнага холдынга «Беркшыр Хатаўэй» 82-гадовы Уорэн Бафет. За год інвестар, у якога ў красавіку гэтага года быў дыягнаставаны рак прастаты, зарабіў $7 млрд, і цяпер яго багацце ацэньваецца ў $46 млрд. Увогуле за год склад «залатой пяцёркі» не змяніўся.

### УСЯГО АДНАГО КУБАЧКА ЁГУРТУ ДАСТАТКОВА, КАБ АБАРАНІЦЦА АД ВЫСОКАГА ЦІСКУ

Калі кожны дзень з'ядаць невялікую порцыю ёгурту, то верагоднасць развіцця гіпертаніі паменшыцца на трацілну, кажуць эксперты. Справа ў тым, што кальцый павышае эластычнасць сасудаў, а значыць, ім робіцца лягчэй адаптавацца да перападаў ціску і пашырацца, піша The Telegraph. Навукоўцы з Універсітэта Мінесоты даследавалі рацыён прыкладна 2000 добраахвотнікаў. Аказалася, тыя, хто еў ёгурт менш за ўсіх, часцей сутыкаліся з гіпертаніяй. А калі 2% калорый у рацыёне прыпадалі на ёгурт, то рызыка высокага ціску падала на 31% тэрмінам да 15 гадоў. Гэта эквівалентна 100-грамоваму кубачку, які з'ядаецца кожны дзень.


ISSN 1990 - 763X


ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### РАСІЯ ДАМОВІЛАСЯ З КЫРГЫЗСТАНАМ АБ РАЗМЯШЧЭННІ ВАЕННЫХ БАЗ

Міністры абароны Расіі і Кыргызстана падпісалі пагадненне аб умовах знаходжання ваенных баз РФ на тэрыторыі рэспублікі. Пра гэта паведамляе агенцтва «24.kg».

Якія канкрэтна ўмовы прапісаны ў гэтым пагадненні, агенцтва не ўдакладняе. Аднак адзначае, што паводле папярэдніх дамоўленасцяў, меркавалася, што новае пагадненне пакіне расійскія ваенныя аб'екты ў Кыргызстане яшчэ на 15 гадоў.

У сваю чаргу, РБК паведамляе, што падпісанае пагадненне ўступіць у сілу з 2017 года (пасля заканчэння тэрміну дзеяння ранейшых пагадненняў). Па інфармацыі агенцтва, яно разлічана на 15 гадоў і можа быць пасля падоўжана яшчэ на 5 гадоў.

Якім чынам было вырашана пытанне аб арэнднай плаце за ваенныя базы РФ, не ўдакладняецца.

Нагадаем, што расійскі бок раней планаваў падоўжыць знаходжанне сваіх баз у Кыргызстане на 49 гадоў. Аднак улады рэспублікі палічылі гэты тэрмін занадта вялікім. У сярэдзіне жніўня прадстаўнік апарата прэзідэнта Кыргызстана заявіў, што кіргізскі бок у гэтым пытанні адстаяў сваю пазіцыю.

КОРАТКА

Небывалы ўраджай яблыкаў чакаецца ў Беларусі сёлета. Паводле ацэнак спецыялістаў, у краіне будзе сабрана не менш за 600 тыс. тон гэтай садавіны.

Карова звалілася ў цагляны склеп глыбінёй 1,5 метра ў вёсцы Драздзы Мазырскага раёна. Гаспадыня звярнулася да выратавальнікаў. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, за 30 хвілін карову падрыхтавалі для бяспечнага падняцця на паверхню: падвялі пад яе вяроўкі, выцягнулі са склепа і паставілі непашкоджанай на зямлю.

Вялікае спартыўна-канцэртнае свята «Каманда маладосці нашай» пройдзе 21 верасня на мінскім стадыёне «Дынама». Яно прысвечана 30-годдзю перамогі мінскіх дынамаўцаў у чэмпіянаце Савецкага Саюза-1982 і 85-годдзю мінскага клуба. Галоўнай падзеяй святочнага вечара стане матч паміж ветэранамі мінскага «Дынама-82» і піцерскага «Зеніта», які стаў чэмпіёнам СССР у 1984 годзе.

Мінскія ўлады чакаюць павелічэння колькасці пасажыраў 22 верасня — падчас акцыі «Дзень без аўтамабіля» і выпусцяць на маршруты дадатковы грамадскі транспарт.

## ЦІ ЁСЦЬ У ВАС ЛЮБІМЫ ГАТУНАК ХЛЕБА?



**Наталля ТАМЕЛА, спявачка, г. Мінск:**

— Мой любімы хлеб — «Радзівілаўскі», вельмі смачны. Хлеб у нас у доме — асноўны прадукт. Мой тата за сталом перш-наперш клапоціцца пра яго і кажа: «Вазьміце хлеба... Дзе хлеб?.. Чаму мала хлеба?..» Я, напрыклад, заўсёды наразаю хлеб тоненькімі лустачкамі, бяру яго пакрысе, а тата здзіўляецца, чаму так мала. У нашай сям'і хлеб — сапраўды галоўны прадукт: бацькі раслі пасля вайны, калі людзі цярпелі нястачу. Хлеб быў дарагім прадуктам, яны ведаюць яму цану. Таму хлеб у нас ніколі не выкідваецца, заўсёды з яго нешта робім, каб нічога не прапала. І гэта перадалося ад бацькоў мне.



**Людміла ХВАСТОВА, настаўніца, г. Пружаны:**

— Нельга сказаць, што ў мяне ёсць нейкі асабліва любімы гатунак хлеба. Я больш схільная купляць самы звычайны чорны хлеб — цаглінку. Гэта хлеб майго дзяцінства. Яшчэ люблю шэры хлеб. Але зараз у крамах выбару больш, таму натуральна, што каштуем розныя гатункі. Падабаецца «Мінскі» і такі вялікі, круглы — здаецца, ён называецца «Нарачанскі».



**Сяргей ШЫЛА, дызайнер, калекцыянер прадметаў традыцыйнай культуры, г. Мінск:**

— Чорны... Хлеб — з зерня нараджаецца, а зерне — аснова ўсяго. Гэта сутнасць, якая ёсць абсалютна ва ўсім: у рэчах, у падзеях, у творчасці, у культуры і ў чалавеку. Без сутнасці нічога не мае сэнсу. І без зерня нічога не можа стварыцца. Гэта ядро, пачатак, аснова росту і развіцця, якое закладзена прыродай. І аснова творчай сутнасці Сусвету, і крыніца творчасці чалавека як часткі Сусвету...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ВОПЫТАМ — ДЗЯЛЮСЯ, ПРАФЕСІЙНЫМІ САКРЭТАМІ — НЕ!

## Лепшы камбайнер краіны расказаў пра сябе, сваю працу і сям'ю



**ЗВЫШ 7 700 тон збожжа намалаціў сёлета камбайнер агракамбіната «Ждановічы» Міхаіл САЛАДУХА. Перадавік пабіў усе рэкорды не толькі на Міншчыне, але і ў рэспубліцы. У шосты раз ён будзе ўдзельнічаць ў рэспубліканскім свяце працаўнікоў вёскі «Дажынкі», што адбудзецца ў Горках.**

З Міхаілам Уладзіміравічам мы сустрэліся ў механічных майстэрнях у пасёлку Кунцаўшчына. Ён аказаўся гаваркім і жартаўлівым чалавекам. «Ваш карміліц? — кіўнуў ён, заўважыўшы ў мяне ў руках дыктафон, і засмяяўся. — А вось гэтым агрэгатам я сабе на хлеб зарабляю».

Мой суразмоўца завіхаўся каля цукраўборачнага камбайна ROPA R20.45K нямецкай вытворчасці. «Камбайн, зрэшты, гатовы да работы, але яшчэ раз падстрахавацца не будзе лішнім. Чалавечы арганізм дае збоі, а гэта ж тэхніка...», — адчуваецца, што машыну ён успрымае, як жывую істоту.

На ўборцы караняплодаў будзе задзейнічаны таксама старэнькі камбайн «Кляйн». Але асноўная нагрузка, бясспрэчна, кладзецца на больш новы. На ім будуць працаваць кругласутачна, пазменна — па 12 гадзін — Міхаіл Саладуха і яго напарнік Віктар Стэльмах, пераможца спаборніцтва сярод моладзевых экіпажаў камбайнаў на жніве і ўдзельнік рэспубліканскіх «Дажынак».

— Сёлета ў агракамбінаце пасаджана 700 гектараў цукровых буракоў. За дзень мы можам выкапаць 22 гектары караняплодаў. Так што, крыху больш чым за месяц управімся з уборкай, — дзеліцца з карэспандэнтам Міхаіл Уладзіміравіч. І жартаўліва дадае: — Толькі б журналісты не перашкаджалі. Калі б не вашы калегі, то я б намалаціў і больш васьмі тысяч тон. А так — не паспееш сесці за штурвал, як чарговая брыгада карэспандэнтаў едзе: маўляў, віншуем з рэкордам! Толькі ад прэсы і даведваўся, хто з маіх калег наперадзе, а хто адстае. Але ж у кожнага свая работа.

— Жніво — гэта добрая магчымасць папоўніць свой сямейны бюджэт. Калі не сакрэт, колькі ўдалося «накасіць» за сёлетнюю ўборку? — падыгрываю дасціпнаму камбайнеру.

— Ніякага сакрэту няма — 34 мільёны рублёў. А разам з прэміямі і яшчэ больш. Ды ўжо палову патраціў, — адказвае ён. — Перш за ўсё уклаў у дом. Як ні круці, а засяліліся сюды амаль 12 гадоў таму.

У 2000 годзе ў агракамбінаце «Ждановічы» сям'і механізатара выдзелілі катэдж з цэнтральным водаправодам, каналізацыяй , прыродным газам. Як заўважыў гаспадар, не горшы, чым гарадская кватэра. Толькі што знаходзіцца за межамі Мінскай кальцавой дарогі, у вёсцы Тарасава. Але дабіраецца да месца работы наш герой без праблем — на асабістым аўтамабілі, ключы ад якога ўручылі на «Дажынках» у 2007 годзе. А ўсяго Міхаіл Уладзіміравіч пяць разоў удзельнічаў у рэспубліканскім фестывалі-кірмашы, займаў 1-е, 2-е, 3-е месцы. Складана быць героем, аднак бытавой тэхнікі, халадзільнікаў, тэлевізараў столькі надарылі, што хопіць і дзецям, і ўнукам.

— Як атрымліваецца ў вас так спрытна пераганяць калег? — цікаўлюся ў камбайнера.

— Па-першае, мне даверылі сёлета новы высокапрадукцыйны камбайн «Лексіён-770», і пакуль што такі ў рэспубліцы адзін. Вопыт, відаць, таксама дапамагае. На жніве я не навічок, упершыню сеў за штурвал камбайна 15 гадоў таму. Спачатку быў памочнікам камбайнера, потым стаў і самастойным, 9 сезонаў, у прыватнасці, на «Лексіёне-480» адпрацаваў. Па-трэцяе, у гаспадарцы сёлета добрая ўраджайнасць збожжавых — 70,1 цэнтнера з гектара.

— А можа, якія асаблівыя сакрэты падслухалі падчас мінулых «Дажынак» у камбайнераў-перадавікоў з іншых рэгіёнаў краіны? — цікаўлюся ў суразмоўцы.

— Мы шмат пра што гаварылі з імі на свяце, зразумела, крыху дзяліліся вопытам. Толькі сакрэт поспехаў ніхто не спяшаўся адкрыць. У кожнага свае прафесійныя таямніцы, — смяецца ён у адказ.

— Не зайздросцяць вашай славе і дастатку суседзі, калегі, знаёмыя? — дапытваюся ў Міхаіла.

Адказвае жартам: маўляў, асабіста я зайздросціў бы сабе...

А калі сур'ёзна, то яго заўсёды шчыра віншуюць з дасягненнямі. Радуецца яго поспехам і сям'я. Яна — надзейны тыл для Міхаіла Саладухі, тут яго разумеюць, падтрымліваюць. У яго цудоўныя дзеці, якія закончылі прафесійна-тэхнічныя каледжы: дачка — лёгкай прамысловасці, сын — машынабудаўнічы, працуюць адпаведна на «Галантэі» і «Амкадоры». Жонка — хатняя гаспадыня. Гэта ў большай ступені яна — як маці і гаспадыня — выхоўвала дзяцей, бо бацька шмат часу аддаваў працы. Дзеці выраслі добрымі і спагадлівымі людзьмі, памочнікамі па хатняй гаспадарцы. А галоўнае, паважаюць бацькоў. Міхаіл Уладзіміравіч для іх — прыклад для пераймання. «Мне ў свой час таксама было прыемна, калі тату і маму віншавалі, уручалі граматы», — заўважыў Міхаіл Саладуха. — Яны, дарэчы, не мелі да сельскай гаспадаркі ніякіх адносін, працавалі на цеплаэлектрастанцыі. А вось мы з братамі — тыповыя аграрыі».

— Мабыць, і свойскую жывёлу трымаеце?

— Пры доме ў нас ёсць падсобныя пабудовы, але апошнім часам, акрамя курэй, не трымаем ніякай жыўнасці. Няма часу і вострай патрэбы ў гэтым, усё можам купіць у магазіне, ды і жонку не хочацца загружаць дадатковымі клопатамі. У нас дом плошчай 118 квадратных метраў, магчыма, і не такі вялікі, але ўсё роўна спраў хапае. І прыбраць, і кашулі памыць, есці прыгатаваць — усё на плячах гаспадыні. А я дастаткова зарабляю, каб сям' я не адчувала ні ў чым патрэбы.

Вось так бы ўсе мужчыны шанавалі сваіх каханых ды забяспечвалі іх матэрыяльна!

Дарэчы, па сакрэце мне сказалі, што Алена Іванаўна жартам называе свайго мужа: «Мая зорка». Яны знаёмыя са школьных гадоў, а пажаніліся ў 1991-м.

— А наконт адпачынку яшчэ не думалі?

— Пакуль рана. Пасля ўборкі караняплодаў трэба камбайны праверыць, калі спатрэбіцца, нешта падрамантаваць, замяніць запчасткі і паставіць на «зімоўку» ў бокс, каб на наступны год паказаць яшчэ лепшыя вынікі... А ўжо затым і пра водпуск можна падумаць, — пачула ў адказ.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## АБЗАЦ

◢ Сезон восеньскіх кірмашоў працягнецца ў Мінску да сярэдзіны лістапада. Да гэтага часу кірмашы ва ўсіх раёнах сталіцы будуць праходзіць па суботах.

◢ **У Беларусі плануецца пабудаваць завод па вытворчасці крэмніевых элементаў і на іх аснове збіраць сонечныя батарэі. Аб гэтым паведаміў учора журналістам старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Беларусі Ігар Войтаў. Цяпер распрацоўваецца бізнэс-план праекта. Завод плануецца пабудаваць у Гомельскай вобласці. Прадугледжваецца, што ў Беларусі асвояць поўны цыкл вытворчасці сонечных батарэй, пачынаючы са стварэння крэмніевых элементаў і заканчваючы зборкай гатовых вырабаў.**

◢ З пачатку года ў Беларусі 66 чалавек атруціліся грыбамі, сямёра памерлі. Па звестках Міністэрства аховы здароўя, колькасць выпадкаў атручвання грыбамі вырасла з надыходам грыбнога сезона. Найбольшая колькасць пацярпелых зарэгістравана ў Мінску — 36 чалавек. Выпадкі са смяротным зыходам адзначаліся ў Мінску, Гомельскай і Гродзенскай абласцях.

◢ **Незвычайны груз, што перавозіўся кантрабандным метадам, выявілі ваеннаслужачыя Гомельскай памежнай групы сумесна з інспектарамі мытні. Правяраючы адзін з вагонаў састава, памежнікі зазірнулі ў міжстолевую прастору. Да столі былі прымацаваныя чорныя бы смоль... валасы. Пры бліжэйшым разглядзе імі аказаліся 2 дзясяткі жаночых шыньёнаў, вырабленых з натуральных чалавечых валасоў. Хадавы тавар быў запакаваны ў 10 цэлафанавых скруткаў. Згодна з папярэдняй ацэнкай, кошт кантрабандных валасоў — каля 18 млн рублёў.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ На аўкцыёне ў Нью-Ёрку 14 кастрычніка будзе прадстаўлены фрагмент месячнага метэарыта. Як паведамляюць інфармагенцтвы, канчатковы кошт лота складзе $340-380 тыс. Вучоныя высветлілі, што камень Дар аль Гані (DAG) 1058 адкалоўся ад цёмнага боку Месяца. Аднак вызначыць, калі менавіта метэарыт упаў на Зямлю, не ўдалося. Фрагмент вагой 1,815 кг быў знойдзены ў Лівіі ў 1998 годзе. Паводле звестак на 2010 год, на нашай планеце знойдзена 134 метэарыты агульнай вагой 49 кг. Сярэдняя цана за 1 грам месячнага каменя складае амаль $40 тыс. Першы месячны камень быў выстаўлены на таргі ў пачатку 1990-х і важыў 19 грамаў.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# З ПАДЗЕМНАГА ТУНЭЛЯ ВЫРАТАВАЛІ ПЯЦЬ ДЫГЕРАЎ

**Праз люк на скрыжаванні сталічных вуліц Няміга і Раманаўская Слабада каля рэстарана «МакДональдс» уначы пяць аматараў вывучэння падземных камунікацый спусціліся ў калектар рэчышча ракі Няміга. Прайшло некалькі гадзін, і гэтыя дыгеры падняліся на паверхню, праўда, ужо пры дапамозе выратавальнікаў і міліцыі.**

Як паведамляе прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама, сітуацыя развівалася па наступным сцэнары. Дыгеры-пачаткоўцы, узброіўшыся неабходным — вяроўкамі, ліхтарамі — спусціліся пад зямлю для даследавання тунэля. Аднак не ўлічылі, што надарыцца моцны дождж. Хоць потым маладзёны сцвярджалі, што цікавіліся прагнозам надвор'я, і інфармацыя пра маючыя адбыцца ападкі іх не спыніла...

У падземным «царстве» дыгеры аказаліся ўпершыню, хоць сярод іх і быў чалавек, які ўжо раней спускаўся ў пячору. Калі вада пачала прыбываць, хлопцы, замацаваўшыся ў адным з тунэляў пры дапамозе вяровак, мусілі папрасіць дапамогі. Выратавальнікі і міліцыя тут жа выбылі па выкліку. Пасля выратавання хлопцаў даставілі ў Цэнтральны РУУС сталіцы для праверкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ОАО «Брестский комбинат строительных материалов» приобретает на баланс общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Брестский комбинат строительных материалов»**

| | |
|---|---|
| Полное наименование и место нахождения | Открытое акционерное общество «Брестский комбинат строительных материалов» г. Брест, ул. Гоздецкого, 28 |
| Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются | Открытое акционерное общество «Брестский комбинат строительных материалов» г. Брест, ул. Гоздецкого, 28 |
| Цель приобретения акций | Продажа инвестору |
| Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель | 1200 (Одна тысяча двести) штук |
| Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции | 600 000 (Шестьсот тысяч) белорусских рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами |
| Срок, форма и порядок оплаты акций | Путем перечисления денежных средств на счет продавца не позднее 30 банковских дней с момента заключения сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям |
| Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций | г. Брест, ул. Гоздецкого, 28 |
| Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров о продаже акций | с 24.09.2012 г. по 12.10.2012 г. |
| Дата начала и окончания покупки акций | с 15.10.2012 г. по 15.11.2012 г. |
| Контактный телефон | 8 (0162) 47 72 67 |

*УНП 200295903.*

23 октября 2012 г. в 14.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. О выплате дивидендов по результатам 3 квартала 2012 г.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 14.00 до 14.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 15.10.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 400022625.

**РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «БРЕСТОБЛГАРАНТ»**

| Номер лота | ЛОТ № 1 |
|---|---|
| Наименование объекта | Капитальное строение с инв. № 130/С-30857, общ. пл. 271 кв.м, в составе: основное строение с двумя кирпичными пристройками и кирпичным сараем |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Завальная, 21 |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | 1 358 484 000 |
| Размер задатка, руб | 135 848 400 |
| Право на земельный участок | право постоянного пользования<br>0,0410 га |
| Условия продажи | С условиями |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Брестоблгарант» |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Условия оплаты | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 24 октября 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация».**

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20% от продажной цены объекта, стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов, комиссионное вознаграждение Поверенному.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 23 октября 2012 г. до 17.00. Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**


# ЛЁГКАЙ УБОРКІ НЕ БЫВАЕ

**— Калі яно прайшло-праляцела? Ужо, лічы, сорак гадоў, як уладкаваўся на працу ў «Астрамечава», — пачаў размову Леанід Сцяпанавіч. — Тады толькі пачыналі будоўлю пасёлка. А сёння наш аграгарадок адзін з самых прыгожых, дагледжаных, зручных, мабыць, не толькі ў Брэсцкім раёне. Дом у свой час атрымаў ад гаспадаркі, даўно ўжо яго выкупілі ва ўласнасць. Работа ёсць, свая гаспадарка немалая, — толькі працуй, не лянуйся.**



Пра тое, што Леанід Марцішка стаў першым у спаборніцтве сярод апаратараў збожжасушыльных комплексаў, сям'я даведалася некалькі тыдняў таму. Як заўважыла жонка Надзея, спачатку нават не паверылі, думалі, нешта можа памяняцца пасля шматлікіх удакладненняў лічбаў. Але калі ў гаспадара папыталі анкетныя звесткі, а потым і запрасілі на прымерку святочнага гарнітуру, усе зразумелі: муж і бацька едзе на рэспубліканскія «Дажынкі». Надзея Міхайлаўна з гонарам расказвае пра мужа, лічыць, што гэтая яго перамога заслужаная — не толькі дзякуючы сёлетняй уборцы, але і многім гадам працы на зямлі. «Спачатку 10 гадоў араў-сеяў на трактары, — узгадвае Надзея Марцішка працоўныя вехі мужа — потым кожную ўборку шчыраваў яшчэ на тых «Нівах» і «Коласах». І заўсёды быў у перадавіках па гаспадарцы, часам і ў раённых спаборніцтвах быў адным з лепшых. Бо чалавек ён вельмі адказны, сумленны. Пазней, калі здароўе крышачку падводзіць стала, перайшоў працаваць у кацельную гаспадарку жывёлагадоўчага комплексу, а на час уборкі заўсёды сушыць збажыну на КЗСах».

Сам старшы апаратар збожжасушыльнай установкі расказаў, што іх СЗК-8 вытворчасці брэсцкага завода паспяхова працуе ў гаспадарцы «Астрамечава» ўжо амаль 15 гадоў. Праўда, яго мясцовыя інжынеры трошачкі мадэрнізавалі, дабавілі аўтаматыкі, паднавілі асобныя дэталі. І машына працавала ўсю ўборку фактычна без перапынкаў на рамонт. 3394 тоны збожжа даведзена да кандыцыі на гэтым комплексе. Як аказалася, гэта самы высокі вынік у вобласці.

Пытаюся, ці была сёлетняя ўборка крыху лягчэйшай за іншыя — надвор'е ж спрыяла? Леанід Сцяпанавіч згаджаецца, што гэтым разам нябесная канцылярыя праявіла лагоднасць, але лёгкай уборкі, на яго думку, наогул не бывае: «Пачынаецца ўборка, і адразу з'яўляецца ўнутраная напруга: гэта ж адказнасць. Ніколі не ведаеш, як тэхніка сябе павядзе, колькі сонечных дзён падорыць прырода».

Звычку працаваць, як ён лічыць сам, Леанід Сцяпанавіч пераняў ад бацькоў. Яны ўсё жыццё здабывалі нялёгкі кавалак хлеба на зямлі, як і жончыны бацькі. Таму і яны з Надзеяй Міхайлаўнай выгадавалі траіх добрых дзяцей, усім далі адукацыю. Сыны зараз пры сваіх сем'ях, жывуць асобна. З бацькамі засталася малодшая дачка Наталля, яна стала педагогам, працуе завучам у школе суседняй вёскі. І ўсе дапамагаюць бацькам апрацоўваць тры гектары зямлі, якія на сямейнай нарадзе вырашылі ўзяць для вядзення падсобнай гаспадаркі. На сваім полі вырошчваюць збожжавыя, буракі, агародніну, каб мець корм для шматлікай жыўнасці. Бо ў гэтай сям'і даўно засвоілі галоўнае правіла: хто добра працуе, той добра жыве.

...За дзень да ад'езду на «Дажынкі» жонка з дачкой Леаніда Сцяпанавіча былі занятыя апошнімі «штрыхамі» святочнага гарнітура героя-дажыначніка. «Спачатку думалі, падбярэм нейкі са сваіх касцюмаў, вунь іх поўная шафа, — смяецца Надзея Міхайлаўна. — Але ж, мусіць, такі парадак, што ўсёй дэлегацыі купілі аднолькавую форму, нібы алімпійцам. Дык хай будзе і гэты». Насамрэч яны хвалююцца, каб усё было добра, каб дарагі чалавек выглядаў бездакорна: гэта ж уся краіна будзе глядзець на яго па тэлевізары!

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Брэсцкі раён.*

# РЭЧЫЦКІЯ ЗНОЎ ПЕРАМАГАЮЦЬ

**Сёлета на Гомельшчыне нарэшце намалацілі мільён тон збожжа. У грамадскім сектары гэтая лічба склала 978 тысяч тон, астатнія 46 тысяч тон «дабралі» за кошт фермерскіх гаспадарак і прысядзібных участкаў насельніцтва. Новы ўраджай на 102 тысячы тон перавышае леташнія паказчыкі.**



Сярод першых па валавым зборы — Буда-Кашалёўскі (87,5 тыс. тон) і Рагачоўскі (86 тыс. тон) раёны, і абсалютны лідар — Рэчыцкі раён (96 тыс. тон). Рэчыцкія працаўнікі традыцыйна падтрымліваюць статус першых і па ўраджайнасці. З гектара тут намалацілі 35,9 цэнтнера збожжа пры тым, што сярэдняя лічба па вобласці склала 28 цэнтнераў з гектара. Летась з галоўнага сельскагаспадарчага свята краіны, якое прайшло ў Маладзечне, аграрыі гэтага раёна прывезлі амаль тры дзясяткі дыпломаў. Сёлета чакаюць, што будзе не менш. Ужо вядома: паводле вынікаў рэспубліканскага спаборніцтва на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур, камбайнеры агракамбіната «Холмеч» Рэчыцкага раёна Валянцін Саламаха і Аляксандр Грань занялі першае месца, кіроўца СВК «50 гадоў Кастрычніка» Мікалай Талкачоў — трэцяе месца. Пачэсныя ўзнагароды яны атрымаюць на рэспубліканскім фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2012» у Горках. Першы намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Сяргей Еўдакімаў вызначае лідараў сярод сельгаспрадпрыемстваў вобласці:

— Першае месца па ўраджайнасці па-ранейшаму ў КСУП «Агракамбінат «Холмеч» Рэчыцкага раёна (дырэктар Віталь Панчанка). Тут атрымана з гектара 60,1 цэнтнера збожжа. У тройку лідараў увайшлі таксама ААТ «Тураўшчына» Жыткавіцкага раёна (дырэктар Андрэй Кузьменка) і СВК «50 гадоў Кастрычніка» Рэчыцкага раёна (старшыня Рыгор Шпакаў). У апошняй гаспадарцы, дарэчы, працуе адзін з лепшых кіроўцаў па адвозцы збожжа ў вобласці Мікалай Талкачоў — у гэтым сезоне ён на аўтамашыне «МАЗ-5551» перавёз 3315 тон.

Мікалай Талкачоў 20 гадоў таму пераехаў у вёску Левашы Рэчыцкага раёна з абласнога цэнтра. Родам ён з суседняга Лоеўскага раёна. Пасля службы ў войску паспеў папрацаваць кіроўцам аўтобуса ў Гомелі. Неяк ехаў на машыне і падвёз пасажыра да вёскі Левашы. Вельмі спадабаліся яму мясцовыя краявіды. Думаў нядоўга — пайшоў да старшыні калгаса спытаць, ці патрэбны гаспадарцы кіроўцы. Праца для хлопца знайшлася. Менавіта так і апынуўся Мікалай Талкачоў у вёсцы. Дарэчы, у гаспадарцы працуе і яго жонка. Дзве дачкі адвучыліся на аграномаў і таксама не імкнуліся з'ехаць у горад, працуюць па спецыяльнасці побач. Яны ніколі не шкадавалі, што пераехалі з Гомеля ў вёску.

Дарэчы, машына, на якой Мікалай Талкачоў ставіць свае рэкорды — далёка не новая:

— Сем гадоў на ёй працую і ўзімку, і ўлетку, яна яшчэ не адзін год будзе ў мяне бегаць, — усміхаецца Мікалай Мікалаевіч.

На працу лепшы кіроўца вобласці прывык прыходзіць рана — трэба ж падрыхтаваць машыну, каб камбайны ў поле не прастойвалі з-за таго, што нешта здарылася з тэхнікай. Хлеб сёлета ў гаспадарцы нядрэнны — каля 50 ц з гектара. Калі да гэтага дадаць прафесіяналізм — атрымаецца добры агульны вынік. Больш за 3 тысячы перавезеных тон збожжа вывелі Мікалая Талкачова на перадавыя пазіцыі. Аднак у кіроўцы гэта далёка не першы поспех на ўборцы збожжавых. На рэспубліканскі фестываль «Дажынкі» ён ужо ездзіў двойчы — у 2005 годзе ў Ваўкавыск і летась — у Маладзечна.

— Першы раз прывёз з «Дажынкаў» халадзільнік, а другі — тэлевізар, было вельмі прыемна, — гаворыць Мікалай. — Я задаволены, што праца аграрыяў сёння заахвочваецца, што нас не забываюць. Ды і цяпер працы хапае. Ідзе нарыхтоўка кукурузы на сілас, сяўба азімых... А адпачываць будзем зімой.

Між тым, сёлета ў Гомельскай вобласці больш за тысячу тон збожжа перавезлі 320 кіроўцаў. 247 камбайнавых экіпажаў пераадолелі тысячную мяжу па намалоце. (Летась такіх было 114.) Сем экіпажаў намалацілі больш чым 2 тыс. тон збожжа. Камбайнеры Валянцін Саламаха і Аляксандр Грань з агракамбіната «Холмеч» Рэчыцкага раёна пяты раз сталі лідарамі жніва ў паўднёвым рэгіёне.

Першы намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Сяргей Еўдакімаў лічыць, што цяперашні аграрны год для Гомельшчыны можна назваць паспяховым. Няпростыя ўмовы надвор'я навучылі спецыялістаў сельскай гаспадаркі вобласці працаваць па сучасных тэхналогіях, атрымліваць высокія вынікі ў раслінаводстве, нягледзячы ні на спякоту, ні на праліўныя дажджы:

— Сёлета гаспадаркі Гомельшчыны зрабілі яшчэ адзін значны крок у раслінаводстве: упершыню на прамысловай аснове вырошчваўся сланечнік. Вытворчасць гэтай культуры, а таксама соі дазволіць забяспечыць жывёлагадоўлю сваім бялком. Мы штогод закуплялі па імпарце каля 60 тысяч тон бялковай сыравіны, у выніку чаго сабекошт прадукцыі заставаўся досыць высокім. Такія вялікія плошчы засявалі ўпершыню, але ўраджай, думаю, будзе нядрэнным. Валавы збор алейных культур чакаецца на ўзроўні 170 тысяч тон, што ў 5 разоў больш, чым летась. Выхад бялковай сыравіны складзе каля 140 тысяч тон, што дазволіць на 88 % забяспечыць патрэбы буйной рагатай жывёлы бялковым сырцом. А гэта значыць — зэканоміць каля 35 млн долараў толькі на бялковай сыравіне.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


**УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**4 октября 2012 года по адресу г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 309 (3-й этаж) в 10.00 проводит повторный аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков, в 11.00 – аукцион по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов**

НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ВЫСТАВЛЯЮТСЯ СЛЕДУЮЩИЕ УЧАСТКИ С НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНОЙ:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Узденский райисполком | Земельный участок: г. Узда – ул. Новицкого, участок № 3 | 0,1389 | 625650100001000514 | 37 904 509 | 1 386 462 |
| Лот № 2 | Узденский райисполком | Земельный участок: г. Узда – ул. Колхозная | 0,0150 | 625650100005000430 | 1 109 326 | 1 635 337 |

Целевое назначение участка по улице Колхозная – для установки и обслуживания торгового павильона, по улице Новицкого – для строительства и обслуживания здания магазина. Участки свободны от строений. Инженерные коммуникации: по улице Новицкого - имеется возможность подведения к газоснабжению, водоснабжению, водоотведению. Срок аренды участков – 25 лет.

НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ ВЫСТАВЛЯЮТСЯ СЛЕДУЮЩИЕ УЧАСТКИ С НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНОЙ:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | агрогородок Озеро Озерский с/Совет | д. Сороковщина, ул.Радужная, уч. № 8 | 0,2500 | 625682510101000053 | 52 000 000 | 84 000 |
| Лот № 2 | агрогородок Озеро Озерский с/Совет | ул. Васильковая, уч. № 11 | 0,1500 | 625682508601000753 | 60 000 000 | 1 114 580 |
| Лот № 3 | Дещенский с/Совет | д. Володьки, ул. Окружная, уч. № 1 | 0,1516 | 625680202201000133 | 40 000 000 | 2 838 290 |
| Лот № 4 | Дещенский с/Совет | д. Володьки, ул. Окружная, уч. № 2 | 0,1516 | 625680202201000134 | 40 000 000 | 2 525 660 |
| Лот № 5 | Дещенский с/Совет | д. Володьки, ул. Окружная уч. № 3 | 0,1585 | 625680202201000135 | 40 000 000 | 2 616 070 |
| Лот № 6 | Дещенский с/Совет | д. Володьки, ул. Окружная, уч. № 5 | 0,1553 | 625680202201000137 | 40 000 000 | 2 832 650 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания жилого дома.
К участкам имеется возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению и водоснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3602631002503 финансового отдела Узденского райисполкома в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600203994, код платежа на право заключения договоров аренды 04002, код платежа по продаже земельных участков в частную собственность 04901. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, второй этаж, кабинет 210, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням с 24 сентября по 28 сентября 2012 года включительно.**

Заключительная регистрация – с 8.30 до 9.55 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

**Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам (801718) 65404, 54705, 65342.**

## НЯДЗЕЛЯ, 30 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.20 Меладрама «Вясна на Зарэчнай вуліцы».**
**8.00** «Майстар падарожжаў». «Дублін і наваколлі».
**8.30** Урачэбныя тайны.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Арсенал.
**9.40** Ведай нашых.
**9.50, 0.20 Серыял «Вясковая камедыя».**
**10.55** «Лёс гігантаў». «ЗАЗ».
**11.25** «Зона Х».
**12.10** Культурныя людзі +.
**13.05** «Мая праўда». «ВІА ГРА». Частка 2-я.
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Фэнтэзі «Зорны пыл».
**17.50** Заўтра — гэта мы!
**18.20** Каробка перадач.
**18.55 Баявік «Місія невыканальная».**
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Журналісцкае расследаванне».
**22.30 Меладрама «Клуб першых жонак».**

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
**9.20** «Смяшарыкі».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** Пакуль усе дома.
**10.50** «Фазэнда».
**11.25** «Брэйн-рынг».
**12.25** «Куміры. Алег Яфрэмаў».
**13.30 Камедыя «Водпуск за свой кошт».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «З каханымі не растаўайцеся!».
**17.20** «Рыцарскі турнір у Мірскім замку».
**18.00 Камедыя «Любоўь-морковь».**
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца ў Адэсе». Фестываль гумару.
**23.05** «Насця». Вячэрняе шоу.
**0.05** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Фюхсэ» (Берлін) — «Дынама» (Мінск).

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.30 Камедыя «Сем нянек».**
**9.05 Камедыя «Змывайся».**
**10.45** Тэлебарометр.
**10.50** Школа рамонту.
**12.00** Вышэй за дах.
**12.35, 23.35** Шоу «Суперінтуіцыя».
**13.40 Драма «Трэнер Картар».**
**16.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Атлант».
**19.20** Суперлато.
**20.05** Спорт-кадр.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Навіны надвор'я.
**21.45 Меладрама «Скрыжаванне».**

### СТБ

**6.20** «Тайны свету».
**7.10** «Далёкія сваякі».
**7.25 «Салдаты-14». Серыял.**
**9.00** «Аўтапанарама».
**9.30** «100 працэнтаў».
**10.00** «Вялікае снеданне».
**10.40 Маст. фільм «Чатыры пяры».**
**12.55** «Добры дзень, доктар».
**13.25 Камедыя «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі».**
**15.15** Ток-шоу «Такі лёс».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40 Маст. фільм «Светлячкі ў садзе».**
**22.35** «Пякельная кухня».
**0.00 Маст. фільм «Апошняе лета ў Байтэ».**

### МІР

**5.00 Маст. фільм «Гэтыя нявінныя забавы».**
**6.30** «Смачны свет. Адыгейская кухня».
**7.00** М/ф «Папугай Кеша і пачвара».
**7.30** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**7.50** М/с «Смяшарыкі».
**8.05** «Ведаем рускую».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** «Даведнік».
**9.40** «Дачныя гісторыі».
**10.10** «Зроблена ў СССР».
**10.40, 3.45** Дак. фільм «Л. Гумілёў. Гісторыя з геаграфіяй».
**11.40, 22.45 Серыял «Сышчык без ліцэнзіі».**
**15.10** «Яшчэ не разам».
**15.50, 21.00 Серыял «Застава».**
**20.00** «Разам».
**22.15** «Па душах».
**1.35 Маст. фільм «Адночы ў правінцыі».**

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.20, 18.10, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**9.30** «Мой любімы гадаванец».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30 «Сінематограф». Маст. фільм «Мост цераз раку Квай».**
**13.25 Драма «Яшчэ адна з роду Болейн».**
**15.20 Фільм для дзяцей.**
**17.40** Ток-шоу «Бульбокс».
**18.15 Трылер «Без твару».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «Татулі без шкодных звычак».**
**22.45 Серыял «Прыстанак».**
**23.35** «Інэт».

### ВТБ

**6.00, 0.30** «PLAY».
**8.00** «Дэкаратыўныя страсці».
**8.30** «Нязоркавае дзяцінства».
**9.00** «Жывыя гісторыі».
**10.00** «Гэта маё дзіця».
**11.00** «Модная прышчэпка».
**11.30** «Дом з мезанінам».
**12.00** «Зрабі мне дзіця».
**12.30, 23.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**13.00 Серыял «Дзетка».**
**14.00** Службовыя раманы.
**14.30** «Зоркавыя дамы».
**15.00, 22.30 Серыял «Метад Лаўровай».**
**16.00** «Гарады свету».
**16.30** Скетч-шоу «Масгарсмех».
**17.00** «Сакрэтныя файлы».
**18.00, 20.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**18.30** «Цвет нацыі».
**20.00** «Нерэальная гісторыя».
**21.00** «Уральскія пельмені».
**0.00** Дэтэктыў «Шлюбнае чытво».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Серыял «Выпрабаванне вернасцю».**
**10.15** «Сам сабе рэжысёр».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.15** «Смехапанарама».
**11.45** «У свеце жывёл».
**12.15 Серыял «Блудныя дзеці».**
**14.15** Да 95-годдзя. «Юрый Любімаў».
**15.15** «Гарадок».
**16.20 Меладрама «Развітанне з Пецярбургам».**
**18.10** Вялікі святочны канцэрт.
**21.25 Меладрама «Восеньскі ліст».**
**23.15** «Нядзельны вечар».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Сужэнцы».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Жывуць жа людзі!»
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома!»
**10.20** «Першая передача».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.15 Меладрама «Бамжыха-2».**
**15.05** «Таямнічая Расія: Краснаярск. Прывіды на разломе?»
**16.20** Следства вялі...
**17.10** «І зноў прывітанне!»
**18.05** «Бывае ж такое!»
**18.30** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**21.50** «Тайны шоу-бізнэсу».
**22.55** Ток-шоу «Мятла».
**23.50 Трылер «Амерыканскія горкі».**

### ІНТЭР+

**8.30** Дак. фільм «Дзеці партэліты».
**9.15, 15.05, 6.45** Краіна смяецца.
**9.30** Школа доктара Камароўскага.
**10.05** Нядзеля з кварталам.
**10.55, 3.45** Арол і рэшка.
**11.40, 22.10** Сваты ля пліты.
**12.05** Скарб.ua.
**12.50, 19.15, 22.35** Глянец.
**13.35** М/ф «Грэх».
**15.20,00.50, 4.30** Канцэрт «Дзень нараджэння Інтэра».
**17.40** М/ф «Пеця па дарозе ў Царства нябеснае».
**20.00, 3.00** Падрабязнасці тыдня.
**20.45** Байцоўскі клуб.
**21.40** Спецыя.
**23.20** М/ф «Стралец непрыкаяны».

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** «Звычайны канцэрт».
**9.35 «Знаёмцеся, Балуеў». Маст. фільм.**
**11.40** «Легенды сусветнага кіно». Одры Хёпберн.
**11.40** «Казка пра цара Салтана». «Вінні-Пух». «Вінні-Пух ідзе ў госці». «Вінні-Пух і дзень турбот». М/ф.
**13.10, 0.05** «Сіла жыцця». Дак. серыял.
**14.05** «Што рабіць?».
**14.50** «Абноўлены шэдэўр. З гісторыі Канстанцінаўскага палаца». Дак. фільм.
**15.45** «Хто там...».
**16.10, 0.55** «Ці быў Напалеон забіты?». Дак. фільм.
**17.00** «Кантэкст».
**17.40** «Нараджэнне акіяна». Дак. фільм.
**19.15** Да 85-годдзя з дня нараджэння Алега Яфрэмава. «Усё няпроста...». Вечар-прысвячэнне.
**20.05 «Тры таполі на Плюшчысе». Маст. фільм.**
**21.25** 95 гадоў Юрыю Любімаву. «Тэатральны летапіс. Выбранае».
**22.15** Спектакль «Усяго некалькі слоў у гонар пана дэ Мальера». Запіс 1973 года.
**1.45** «Лаўка». М/ф для дарослых.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Творчы вечар Аркадзя Арканава». 1990 год.
**6.05** «Ранішняя пошта». 1988 год.
**6.40** «Аповесці Белкіна. Выстрал». Спектакль.
**8.00, 2.00** «Праз трыццаць гадоў». Г. Таўстаногаў. 1986 год.
**9.00** «Колба часу».
**10.00** «Мелодыі даўніх гадоў». Кінаканцэрт.
**11.00** «Да і пасля...». 1961 год.
**12.10** «Блакітны агеньчык». 1962 год.
**12.50** «Песня-71».
**13.45** «Відавочнае — неверагоднае». 1989 год.
**15.00 «Таня». Маст. фільм.**
**17.00** «Поле цудаў». 1991 год.
**18.00, 3.00** «Народжаны ў СССР».
**19.00** Дабрачынны канцэрт для студэнтаў тэатральных вучылішчаў. 1991 год.
**20.00** «Тэатральныя сустрэчы». 1966 год.
**21.50** «Балет Ігара Маісеева». Фільм-канцэрт.
**23.00** «Расказ пра трэці Усесаюзны фестываль маладзевых тэатраў». Дак. фільм.
**0.40** «Бушуе «Маргарыта». Фільм-канцэрт.
**4.00** «Погляд». 1989 год.

### MTV

**5.00, 1.20** Music.
**6.30** Шпількі Чарт.
**7.30, 8.45** «Губка Боб». М/ф.
**8.20** «Котасабака». М/ф.
**9.35** «Крутыя бабры». М/ф.
**10.00** News блок Weekly.
**10.30 «Палавінкі». Серыял.**
**11.00, 21.00** Тайн.net.
**12.00, 22.00** «Канікулы ў Мексіцы-2».
**18.00** MTV Special:Новыя рускія прынцы.
**19.00 «Пікап. Здыманне без правіл». Маст. фільм.**
**23.00** Big Love Чарт.
**0.00** Трэндзі.
**0.30** Пляж.

### EUROSPORT

**9.30** Вось гэта дзіва!!!
**9.45** Марафон.
**12.30, 17.30** Футбол. Чэмпіянат свету (U-17).
**14.00, 16.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно.
**14.45, 22.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні гран-пры.
**20.30** Бокс. Баі ў цяжкай вазе.
**23.40** Тэхналогія чэмпіёнаў.
**23.45** Мотаспартыўны ўік-энд.
**0.00** Ралі. IRC.
**0.30** Настольны тэніс. Мужчыны. Кубак свету.

### НАША КІНО

**6.35, 12.35** Меладрама «Печкі-лавачкі».
**8.30, 14.30** Камедыя «Карнавал».
**11.00, 17.00** Драма «Выпадковы вальс».
**18.30, 0.30** Драма «Узнятая цаліна». 1-я серыя.
**20.30, 2.30** Драма «Узнятая цаліна». 2-я серыя.
**22.30, 4.30** Драма «Узнятая цаліна». 3-я серыя.

### ДОМ КІНО

**3.00, 19.05** (заключная серыя) Серыял «Ясенін».
**3.50** Камедыя «Забіць карпа».
**5.30** Прыгоды «Прарыў».
**6.50** Мюзікл па-руску «На падмостках сцэны».
**8.15** Дэтэктыў «Пярсцёнак з Амстэрдама».
**9.45** Экранізацыя школьнай праграмы. І. Тургенеў «Зацішша».
**11.55, 19.00, 2.55** «Акно ў кіно».
**12.00** Драма «Гарачая субота».
**13.45** Камедыя «Тры дні ў Маскве».
**16.00** Меладрама «Знайдыш-3».
**20.00** Золата «Масфільма». «Звычайны цуд».
**22.20** Драма «Морфій».
**0.15** Драма «Гэта было мінулым летам».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Камедыя «У адно цудоўнае дзяцінства».
**6.10, 10.10, 14.10** М/с «Шапакляк». М/ф «Шэры воўк энд Чырвоная Шапачка».
**7.00, 11.00** Фільм-казка «Самы дужы».
**8.20, 12.20** Легенды і міфы старажытнай Грэцыі. «Арганаўты». М/ф «Калыханка».
**15.00** Фільм-казка «Пунсовая кветачка».
**16.10** М/с «Чабурашка ідзе ў школу». М/ф: «Вася і дыназаўр», «Пра бегемота, які баяўся прышчэпак», «Воўк і цяля».
**17.00** М/ф «Пайдзі туды — не ведаю куды».
**18.00** М/ф «Краса ненаглядная».

### ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «На рагу ля Патрыяршых-2».
**20.00, 2.00** Серыял «Опергрупа».
**21.00, 3.00** Серыял «Абарона Красіна».
**22.00** Серыял «Юркавы золкі».
**23.30** Серыял «Наступнаму стагоддзю». 1-я серыя.

### ТБ3

**5.00, 4.45** М/ф.
**7.30** Маст. фільм «Узброены і вельмі небяспечны».
**9.30** Зоркі і містыка.
**10.15** Маст. фільм «Кін-дза-дза».
**13.00** Маст. фільм «Дзевяць ярдаў».
**15.00** Х-Версіі.
**16.00** «Паралельны свет».
**17.00** Каханне па зорках.
**18.00** Маст. фільм «Танга і Кэш».
**20.00** Маст. фільм «Адзіночка».
**22.15** Маст. фільм «Наёмныя забойцы».
**0.45** Маст. фільм «Планета страху».
**2.45** Маст. фільм «Зямля Саннікава».

### ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Камедыя «Душэўная кухня».
**10.45, 18.45, 2.45** Камедыя «Больш, чым сябар».
**12.35, 20.35, 4.35** Меладрама «Піяніна».
**14.40, 22.40, 6.40** Драма «Флэйм і Цытрон».

### ТБ1000

**3.00** Драма «Памерці наноў».
**5.20** Драма «Авіятар».
**9.00** Баявік «Зона высадкі».
**10.55** Трылер «Цана страху».
**13.05** Камедыя «Міс Кангеніяльнасць».
**15.00, 23.50** Баявік «Гадзіна пік».
**16.50** Драма «Я так даўно цябе кахаю».
**19.00** Трылер «Прамая і яўная пагроза».
**21.40** Трылер «Гульні патрыётаў».
**1.30** Баявік «Гадзіна пік 2».

### ІЛЮЗІЁН

**0.40** Наглядчык.
**2.15** Адзінокі мужчына.
**4.20** Бяжы без аглядкі.
**6.20** Мядовы месяц.
**8.15** Без мужчын.
**9.50** Глухі пралёт.
**11.25** Доказ смерці.
**13.20** Не кажы нікому.
**15.35** Круты паварот.
**17.30** Спекулянт.
**19.30** Жанчына ў пятым.
**21.05** Знайсці Аманду.

### РАМАНТЫКА

**5.00, 5.50** «Дамы сям'і Гілмор».
**6.40, 7.30, 8.20** Шпік.
**9.10, 10.00, 10.50, 20.00, 20.45** Бацькі.
**11.40, 18.30** Пляткарка.
**12.30, 19.15** Жыццё як шоу.
**13.20** Маст. фільм «Сястрынская нянавісць».
**14.50** Камедыя «Бацькі».
**17.00** Драма «Са школьных гадоў».
**21.35, 22.25, 2.30, 3.15, 4.05** Цяжарнасць на абцасах.
**23.20** Сямейнае дрэва.
**0.50** Камедыя «Напярэдадні вяселля».

### DIVA UNIVERSAL

**7.00, 17.50, 20.20, 0.30** «Дваяжэнец».
**7.50** «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
**12.00, 17.00** «Смачнае захапленне+».
**12.50** «Амазонія».
**18.40, 19.30, 1.25** «Спакуснік».
**21.10, 23.40** «Такое жыццё».
**22.00** «Бывай, бурлеск».
**2.20** «Мая Папялушка».

### AXN-SciFi

**0.20, 0.40, 9.00, 9.25, 9.55** Серыял «Сшытак смерці».
**1.10, 1.55, 2.40, 12.45, 13.30, 14.15** Серыял «Вавілон 5».
**3.25, 5.00, 11.15** Серыял «Андрамеда».
**4.15, 5.45, 6.35, 12.00, 15.55** Серыял «Зорныя вароты».
**4.15, 4.35, 8.00, 8.25, 14.45, 15.00** Серыял «Зорны дэсант».
**8.10, 8.40, 15.00, 15.25** Серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**10.20, 17.35, 21.25, 23.25** Серыял «Стаўпы Зямлі».
**18.30, 19.55** Серыял «Чорная лагуна».
**21.10** Серыял «Каўчэг».

***У праграме магчымыя змяненні. Передрукоўка праграмы забаронена!***

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 12.00** Цуды інжынерыі.
**6.00** Лясное царства.
**7.00** Малпы ў горадзе.
**8.00** Мяжа.
**9.00** Дзікія жывёлы Поўначы.
**10.00** Экамегазбудаванні.
**11.00** Мегазаводы.
**13.00** У пошуках акул.
**14.00** Рэальнасць або фантастыка.
**15.00** Супердрапежнікі.
**16.00** Ноч ільва.
**17.00** Зграя.
**18.00** Як стварыць працуючае сэрца.
**19.00, 1.00, 4.00** Расследаванне авіякатастроф.
**20.00, 23.00, 2.00** Патанулая субмарына фашыстаў.
**21.00, 0.00, 3.00** Карабельпрывід: уваскрэсенне.
**22.00** З пункту гледжання навукі.

### DISCOVERY

**7.00, 7.25** Маланкавыя катастрофы.
**7.55, 3.35** Вынайсці будучыню.
**8.50, 14.20, 23.00, 2.45** Разбуральнікі легендаў.
**9.45, 4.25** Як гэта ўстроена?
**10.10, 4.50** Патрабуецца зборка.
**10.40** Выжыць любой цаной.
**11.35** Правілы пазадарожнага руху.
**12.30, 18.00, 19.00, 20.00** 80 спосабаў абагнуць зямны шар.
**13.25, 22.00** Лабараторыя для мужчын.
**15.15, 0.00** Гісторыя электрычнасці.
**16.10** Дылеры.
**17.05** У пошуках еці.
**21.00** Дынама.
**1.00** Вершнікі пекла.
**1.55** Прастак за мяжой.
**5.15** Авіякатастрофы.
**6.05** Палёты ўглыб Аляскі.

### TRAVEL

**8.00, 13.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 0.00, 1.00, 5.00** Сусветны падарожнік.
**9.00** Мегаполіс.
**10.00** Этычны геданіст.
**11.00, 22.00, 3.00** Бясстрашныя падарожнікі.
**12.00** Планета спорту.
**14.00, 2.00** Сусветная адысея.
**15.00** Падарожжа сёння.
**15.30** Аман знутры.
**16.00** Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
**21.00, 21.30, 7.00, 7.30** Сафі Грыгсан.
**23.00, 4.00** Рэальна.
**23.30, 4.30** Берт заваёўнік.
**6.00** Шалёная француженка ў Грузіі.

### ANIMAL PLANET

**7.00** Разбуральнікі стэрэатыпаў.
**7.25** Маёнтак сурыкатаў.
**7.50** Заасад Крыса Хамфры.
**8.15** Незвычайныя жывёлы.
**9.10** Дзік і Дом спяшаюцца на дапамогу.
**9.35** Прыроджаныя паляўнічыя.
**10.05, 5.45** Уводзіны ў сабаказнаўства.
**11.00** Паляўнічы на кракадзілаў.
**11.55** Акулавыя псіхааналітыкі.
**12.50, 13.45** Планета мутантаў.
**14.40, 15.05** Таварыства па ратаванні жывёл.
**15.35, 16.00** Ратаваць дзікую прыроду Афрыкі.
**16.30** Котак не любіць нельга.
**17.25, 17.50** «Аэрапорт для жывёл».
**18.20** Прыгоды Осціна Сцівенса.
**19.15** Паляўнічы на яд.
**20.10** Перакладчык з сабачай.
**21.05, 2.25** Бітва за акул.
**22.00, 3.15** Акулы-людаедкі.
**22.55, 4.05** Якія ваююць са шкоднікамі.
**23.50** Дзікія і небяспечныя.
**0.45** Дэніэл і нашы коткі.
**1.35** Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
**4.55** Нашэсце кальмараў.
**6.35** SOS Дзікай прыроды.

### ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Элемент здароўя.
**5.40, 20.40** Гімнастыка.
**6.10, 21.10** Зона рызыкі.
**6.50, 21.50** Мужчынскія сакрэты.
**7.30, 22.30** Практыка здароўя.
**8.00, 23.00** Панацэя.
**8.40, 23.40** Нетрадыцыйная медыцына.
**9.20, 0.20** Школа розуму.
**9.55, 0.55** Шлях да здароўя.
**10.30, 1.30** Якасць жыцця.
**11.00, 2.00** Я расту.
**11.40, 2.40** Не выходзячы з дому.
**12.20, 3.20** Праўда пра пахудзенне.
**12.50, 3.50** Масажы.
**13.30, 4.30** Жаночае здароўе.
**14.10** Генезіс здароўя.
**14.55** Зялёная аптэка.
**15.35** Педыятрыя.
**16.05** Дыялогі пра харчаванне.
**17.10** Дыягназ невядомы.
**18.10** Тэрапія.
**18.45** Найноўшыя дасягненні.
**19.25** Будзь у тонусе!

### ТДК

**6.00, 7.50, 13.50, 16.55, 17.50, 18.50, 21.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 21.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00, 0.30** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.00, 2.10** Нашы дзеці.
**14.00, 1.20** Твой дом.
**19.00, 22.50, 4.00** Люстэрка жыцця.
**22.00, 23.40** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Маст. фільм.

## МІМА КАСЫ

**Мінскі кінатэатр «Цэнтральны» стаў першым, на сеансы якога можна купіць квіткі анлайн.**

Цяпер, каб схадзіць у кіно, вам не трэба бегчы ў касу за квітком загадзя. Можна проста зрабіць гэта праз інтэрнэт у рэжыме анлайн. Зайшоўшы на сайт kinoteatr.megamag.by, выбіраеце «Цэнтральны», дату, цікавы вам фільм, час сеанса і бранiруеце найбольш зручныя для вас месцы. Аплаціць забраніраваныя квіткі можна любым спосабам, даступным на сайце: інтэрнэт-банкінг, праз банкамат альбо інфакіёск, аплата наяўнымі грашыма ў касе пры атрыманні забраніраванага на сайце квітка. У выпадку аплаты праз інтэрнэт вы самі раздрукоўваеце квіток на хатнім прынтары і з «рукатворным дакументам» ідзяце ў кіно.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

■ Глыбінка

# НЕАПАЛІМЫЯ ЛЯЦЯГІ

**Кожны год у верасні ў Ляцягах Слаўгарадскага раёна адбываецца вясковае свята: людзі хрэсным ходам з абразом Божай Маці «Неапалімая купіна» абходзяць вёску, каб абараніць яе ад бедаў і няшчасцяў. Гэтая традыцыя вядзе свой пачатак ад Вялікай Айчыннай вайны.**



Таццяна Сяргееўна САЗОНАВА, захавальніца абраза Божай Маці.

### Вера ў лепшае

Дзень 17 верасня ў Ляцягах традыцыйна пачынаецца ў маленькай вясковай царкве. Яна знаходзіцца ў звычайным доме, але ад гэтага, здаецца, набывае яшчэ больш чароўнасці, хатняй і цёплай. На сценах вісяць абразы, упрыгожаныя ў старасавецкім стылі фольгай і кветкамі. Ажурныя фіранкі, вышытыя ручнікі і абрусы... На падлозе — мяккія вясковыя «кругі». На стале — букеты з восеньскіх кветак і традыцыйныя булкі. Усё гэта асвятляецца мяккім святлом свечак.

Пеўчыя спяваюць тонкімі кранальнымі галасамі. Бабулі ў святочных чырвоных хустках шэпчуць малітвы і хрысцяцца. Айцец Георгій, настаяцель Свята-Петра-Паўлаўскага храма ў аграгарадку Лясная вядзе службу, а потым запрашае жанчын на хрэсны ход.

Крыж наперадзе нясе самая маладая жанчына, за ёй — бабулі з абразом «Неапалімая купіна», святар з крыжам у руцэ. Вядома, гэта не самая вялікая грамада, усяго крыху болей за дзясятак чалавек, але ўражанне ўсё ж робіць вялікае. Найперш сваёй шчырасцю, бо амаль 70 гадоў кожны год гэтыя людзі нясуць па вясковых вуліцах абраз з верай у лепшую будучыню.

### Нават вайна адступіла

Абраз «Неапалімая купіна» называюць у Ляцягах сваім ахоўным.

— «Неапалімая купіна» вельмі шануецца ў Беларусі і іншых краінах, — нагадвае айцец Георгій. — У народнай свядомасці абраз ратуе ад бед і, найперш, пажараў. Таму ў гады вайны людзі да яго звярталіся з малітвамі аб заступніцтве.

Абраз, што носяць вакол Ляцягаў, напісаны ў ваенны час. У 1943 годзе, калі да гэтых мясцін набліжаўся фронт, мясцовыя жыхары былі ў паніцы: яны баяліся (і не дарма), што немцы пры адступленні могуць спаліць паселішча.

— Жанчына з нашай вёскі, якая малілася Богу, замовіла ў Магілёве абраз «Неапалімая купіна», і дзве бабулі пешшу прынеслі яго з Чавусаў, — расказвае Таццяна Сяргееўна Сазонава. — І гэтым абразам мы тады абнеслі Ляцягі. Я, 14-гадовая дзяўчынка, пайшла ўслед за дарослымі. Мы ішлі па шляху, а адно гумно было ўбаку. Было позна, і вырашылі да яго не ісці. Дык пры адступленні немцы толькі тое гумно і спалілі. Маці Божая ночку не спала, нас ахоўвала. І мы засталіся жывыя, і хатачкі нашы цэлыя.

— Лінія фронту на Проні стаяла 9 месяцаў, і Ляцягі былі ў зоне абстрэлу, — расказвае айцец Георгій. — Але, у адрозненне ад суседніх, вёска засталася цэлая. Гэта дзіўна, і нават скептыкі не могуць гэта растлумачыць. Бо вёскі ў некалькіх кіламетрах адсюль былі спалены, і людзі жылі ў зямлянках. А тут снарады трапілі толькі ў сады гаспадарчыя пабудовы.



З тых часоў вясковы люд вырашыў, што абносіць абразом Ляцягі трэба штогод. Так і робіцца.

### На покуці

Хрэсны ход ад царквы спачатку ідзе да хаты Сазонавых. Таццяна Сяргееўна — захавальніца ахоўнага абраза, які передалі ёй старажылы. Жанчыне ўжо 85 гадоў, але яна, хоць і з кійком, разам з усімі ідзе хрэсным ходам і моліцца за спакой вёскі.

— Гэты абраз і цяпер ахоўвае нашу вёску! — кажа бабуля.

— Безумоўна, абраз дапамагае людзям, — не мае сумненняў і яе сяброўка Марыя Сяргееўна Корнева. — Часам так здараецца, што ў іншых вёсках ураган і дахі здымае, і дрэвы з каранямі павырывае навокал, а ў нас усё спакойна, без вялікіх бед, дзякуй Богу.

Ля варот дома тым часам адбываецца абрад: усе цалуюць «Неапалімую купіну» і праходзяць пад абразом. Потым маладзейшыя са святаром ідуць абходзіць вёску, усе пабудовы і палеткі, а таксама і помнік ахвярам Другой сусветнай вайны, а састарэлыя людзі застаюцца ў хаце.

«Неапалімая купіна» месціцца на покуці. Гэтая нияркая выява на цёмнай драўніне ўбрана ў святочныя ручнікі і кветкі, перад абразом — пірог і запаленая свечка ў ім. Людзі моляцца, проста сядзяць побач, ціха размаўляюць. Сама гаспадыня, у святочнай кашулі з карункамі і бардовай хустцы, узгадвае мінулае. Плача і ўсміхаецца. Думае пра будучыню.

— Абраз я перадам малодшай дачцэ Кацярыне, і яна будзе пасля мяне клапаціцца пра абрад, — паведаміла Таццяна Сяргееўна. — Увогуле ў мяне 4 дачкі, 8 унукаў, 7 праўнукаў, зяці. І ўсе добрыя, каб усім такіх Бог даслаў. Гэта таксама ад яе, маёй Божай Матачкі.

— Дзеці нашы будуць верыць у Бога, і таксама, як мы, хадзіць, — падтрымлівае аднавяскоўку Ева Арцёмаўна Брыткіна.

### Смачна жыць

Пасля хрэснага хода захавальніца абраза запрашае аднавяскоўцаў і гасцей на абед. Гэта частка традыцыі, і людзі лічаць за гонар браць у ёй удзел. Месцаў, талерак і лыжак можа ўсім і не хапіць, але ўсе нязменна шчаслівыя і задаволеныя ежай і стасункамі.

Гатуюць абед дочкі Сазонавай. Валянціна Клепчанкова працуе інжынерам у Магілёве і штогод плануе выхадны на 17 верасня, каб дапамагчы маці прыняць гасцей.

— Не, не шкада ні высілкаў, ні грошай, — Валянціна не крыўдуе на прамое пытанне пра выдаткі на абед. — Маці заўсёды рабіла гэта ад душы і сэрца. Яна кажа нам, што ўсю пенсію аддасць, але гасцей смачна накорміць. І мы шчыруем.

На стале няхітрая вясковая страва, але як заўсёды — цэлае адкрыццё для гараджаніна, бо ўсё з печкі. Ячны крупнік з грыбамі, тушаная капуста, бульба з мясам, пірагі, аладкі, кампот. Смаката!



— Мы хочам, каб людзям было добра, — гавораць у Сазонавых. — Мы ўсё жыццё ведаем гэтую гісторыю, і нам яе працягваць. Мы сапраўды верым, што вёску ўратаваў той абраз. Нашы дзеці пра гэта ведаюць і ўнукі. Ёсць нешта вышэйшае, што зберагае нас і ахоўвае ў нашы цяжкія дні. Так што абрад будзе жыць.

### Божая вёска

Гавораць, што кожнае паселішча мае свой характар, як і кожны чалавек.

— Гэта вёска вельмі прыстойная і добрая, тут жывуць сардэчныя людзі, — так характарызуе Ляцягі старшыня Гіжэнскага сельскага Савета Тамара Мельнікава. — І тут вельмі прыгожыя мясціны: непадалёк рака Проня, поўныя грыбоў лясы. Людзі ўтрымліваюць сваю вёску ў чысціні і парадку.

Ляцягі ў акрузе называюць яшчэ божай вёскай, і ўсе вельмі спадзяюцца, што яна сапраўды захаваецца і будзе жыць. Хваляванні недарэмныя, таму што ў Гіжэнскім сельсавеце (як і ў іншых) ліквідуюцца, знікаюць з картаў, нежылыя паселішчы.

У Ляцягах цяпер 44 двары і 77 жыхароў. Большасць мясцовых — пенсіянеры. І трымаецца вёска на тым, што цяперашнія бабулі і дзядулі выхавалі добрых дзяцей, якія не кідаюць сваіх старых.

Разам з тым Тамара Мельнікава мае і аптымістычны погляд: апошнім часам на Слаўгарадчыне развіваецца шмат сельскіх праектаў з дапамогай міжнародных арганізацый, і ў Гіжэнцы ёсць таксама некалькі, каб прыцягнуць людзей, дапамагчы ім зарабіць грошы з дапамогай уласных гаспадарак і ў выніку палепшыць жыццё ў вёсцы. Магчыма, што ў будучым Ляцягі падпадуць пад праект па малацэ, гадаванні свіней ці птушкі. Так што сітуацыя, спадзяецца старшыня, зусім не тупіковая, проста трэба жыць і працаваць.

### Любоў да людзей

Праваслаўны прыход у Ляцягах быў адроджаны 10 гадоў таму. Усё няпроста: царква тут была разбурана яшчэ да вайны, а на яе адраджэнне не хапае сродкаў.

— Але нашы бабулі думаюць жыць да ста гадоў і болей і ўпэўнены, што храм тут павінен быць, — усміхаецца айцец Георгій, які ведае ўсіх ляцягскіх вернікаў у твар і па імёнах. — Вядома ж, Ляцягі пусцеюць, і з кожным годам на хрэсны ход выходзіць усё менш людзей. Але абрад усё ж захаваўся. І маладыя таксама з гарадоў прыязджаюць: тут іх радзіма, карані і «Неапалімая купіна», якая яднае людзей.

Інтарэс да традыцый, якія зусім не супярэчаць імклівай сучаснасцю, відавочны. Хрэсны ход час ад часу суправаджаюць тэле- і фотакамеры журналістаў, а сёлета ў ім з'явілася (нечакана) дзяўчынка з відэакамерай у руках.

— Гэта я на памяць здымала, — расказала 10-гадовая Марыя Прачуханава. — Мне тут цікава.

Маша першы раз прыехала ў Ляцягі са Слаўгарада разам са сваёй маці, якая спявае ў царкоўным хоры.

— Я ведаю, што калі вёску абразом абнясуць, то ўсё будзе добра, — даверліва расказвае дзяўчынка.

### Прыязджайце зноў!

Ларыса Негарэ нядаўна з'ехала з сям'ёй у Слаўгарад, дзе пабудавала новую кватэру. Жыве ў камфортных умовах, знайшла працу ў бальніцы, але 17 верасня — святы для яе дзень, і яна адпраўляецца ў родныя Ляцягі, каб на правах самай маладой і моцнай жанчыны ўзначаліць хрэсны ход.

— Мяне сюды цягне, і пачуцці ў мяне ад гэтай падзеі самыя светлыя, мне лёгка і радасна, — кажа Ларыса.

На заканчэнне ляцягскія бабулі развітваюцца, раздаюць булкі «на дарожку», і запрашаюць прыязджаць налета. Яны дакладна ведаюць, што зноў пойдуць хрэсным ходам з абразом «Неапалімая купіна», каб абараніць свой свет ад усіх бедаў.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**
*Слаўгарадскі раён.*

■ Кажуць, што...

## ...У Нясвіжскі палац могуць не пусціць некаторых турыстаў?

**Як высветлілася, такое верагодна толькі на выхадных, у час найбольшага наплыву наведнікаў, пры ўмове, што колькасць ахвотных трапіць на экскурсію будзе занадта вялікай для аднаго дня.**

Пра магчымасць у будучыні абмежаваць паток турыстаў паведаміў дырэктар дзяржаўнай установы «Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» Сяргей Клімаў. Па яго словах, колькасць ахвотных пабываць у Нясвіжскім палацы няўхільна расце, а калі так здарыцца, што лік турыстаў перавысіць паўмільёна чалавек за год, можа ўзнікнуць пагроза для экспанатаў. Каб даведацца, як жа турысты могуць нашкодзіць каштоўным музейным рэліквіям і па якіх крытэрыях будуць выбіраць тых, хто не трапіць на экскурсію, карэспандэнт «Звязды» звярнулася па каментар у адміністрацыю музея.

Як патлумачыла начальнік аддзела па сувязях з грамадскасцю Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» Кацярына Хаванская, пастаянны вялікі натоўп у музейных залах шкодны перш за ўсё з-за змены асяроддзя, дзе павінны захоўвацца экспанаты.

— Як вядома, для некаторых старадаўніх рэчаў у музеях ствараюць і падтрымліваюць умовы з пастаянным узроўнем вільготнасці і тэмпературы. Калі ж у зале знаходзіцца шмат людзей, гэтыя паказчыкі рэзка змяняюцца, — сказала суразмоўца.

Адносна абмежавання наведвання музея Кацярына Хаванская адзначыла, што крытэрый тут толькі адзін — па колькасці.

— Звычайна самыя напружаныя дні — субота і нядзеля. Усіх, зразумела, прыняць немагчыма, — удакладніла яна.

Найбольш лёгка трапіць на экскурсію можна ў будныя дні. У гэты час няма праблем і з экскурсаводам. Тым, хто ўсё ж пакіне свой выбар на экскурсіі падчас уік-энду, супрацоўнікі музея могуць прапанаваць запісацца на бліжэйшую вольную дату. Кошт наведвання, нагадала Кацярына Хаванская, аднолькавы як для беларусаў, так і для замежнікаў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

